

*Л.**Альпяровіч**. Вечар у сям'і. Канец 1900 — пач. 1910-х гг.*

92), скончыў рысавальную школу ў Адэсе (1896), Пецярбургскую акадэмію мастацтваў (1902). З 1902 жыў і працаваў у Мінску. Творчасць звязана з маст. жыццём Расіі і Беларусі. Пісаў партрэты, пейзажы, быт. кампазіцыі (многія маюць характар незакончаных эскізаў). У жывапісе прытрымліваўся прынцыпаў рэалізму. Для графічных работ характэрна высокая культура рысунка. Сярод твораў: жывапісныя «Партрэт музыканта Жухавіцкага», «Жаночы партрэт», «Вечар у сям'і», «Швеі», «Маляры»; графічныя «Партрэт дзяўчынкі», «Партрэт старога» (усе канец 19 — пач. 20 ст.) і інш. Садзейнічаў арганізацыі выстаўкі перадзвіжнікаў у Мінску (1899), прымаў удзел у маст. выстаўках Масквы і Мінска. У 1939 творчасць А. найб. поўна (230 работ) была прадстаўлена на выстаўцы ў Мінску. Усяго ў сучасных музейных фондах Беларусі захоўваецца каля 50 жывапісных і графічных работ мастака.

*Літ.*: В а й ц я х о ў с к а я В.У. Л.А.Альпяровіч і ягоны жывапіс у зборы музея // Паведамленні Нацыянальнага музея Рэспублікі Беларусь. Мінск, 1997. Вып. 2; У с а в а Н.М. Малюнкі Л.А.Альпяровіча ў зборах музея // Там жа.

**АЛЬТ** (італьян. alto ад лац. altus высокі), партыя ў хоры ці вакальным ансамблі, якая выконваецца нізкім дзіцячым ці нізкім жаночым (мецца-сапрана, кантральта) галасамі. Дыяпазон g/a — es2 (e2). Другая па вышыні партыя ў харавой партытуры. Назва замацавалася ў сярэдневяковай поліфаніі як абазначэнне галасоў, вышэйшых за *тэнар*. Да альтавых адносяць партыі Вані з оперы «Іван Сусанін» М.Глінкі, Саўкі з оперы «Марынка» Р.Пукста і інш.

**АЛЬТА́НКА** (італьян. altana), паркавае збудаванне, звычайна лёгкай ажурнай канструкцыі, прызначанае для адпачынку, аховы ад сонца і ападкаў. Пачынаючы з перыяду барока будаваліся ў палацавых і сядзібных парках, на перакрыжаванні ці заканчэнні кампазіцыйных восей (в. Вял. Мажэйкава Шчучынскага р-на, г.п. Свіслач, 19 ст.). У рамантычных і пейзажных парках (18—19 ст.) А. размяшчалі ў маляўнічых кутках, на востраве пасярод сажалкі ці на яе беразе (вёскі Дудзічы Пухавіцкага, Кушляны Смаргонскага, Манькавічы Пастаўскага, Станькава Дзяржынскага р-наў). Канструкцыйную аснову звычайна складалі каркас ці слупы, якія падтрымлівалі шатровы ці купалападобны дах. Мураваныя А. стылю класіцызму (г. Нароўля) звычайна выкарыстоўвалі ордэрныя сістэмы. Эфектнае архіт. вырашэнне і выразнасць яе канструкцый заўсёды рабілі гэтае невял. збудаванне кампазіцыйным акцэнтам. Зараз А. размяшчаюць у дварах жылых дамоў у мікрараёнах і ў сельскай мясцовасці, школ, дзіцячых садоў, лячэбных і аздараўленчых устаноў, у зонах адпачынку на вадасховішчах, у месцах прыдарожнага адпачынку. А. на набярэжнай можа спалучацца са спускам да вады (на беразе р. Свіслач у цэнтры Мінска). *С.А.Сергачоў.*

*Альтанка-маяк у г. Нароўля.*



**АЛЬТРУІ́ЗМ** (франц. altruisme ад лац. alter іншы), этычнае вучэнне, якое прапаведуе бескарыслівы клопат пра шчасце і дабрабыт інш. людзей, гатоўнасць ахвяраваць асабістымі інтарэсамі; прынцып адпаведных паводзін. Тэрмін «А.» уведзены ў 1830-я гг. франц. філосафам А.Контам як процілеглы эгаізму. У адрозненне ад калектывізму А. арыентаваны не на карысць грамадству ў цэлым, але на дабро бліжняму, канкрэтнаму чалавеку. Альтруістычныя ідэі ёсць у этычных вучэннях сусв. рэлігій, асабліва ў будызме і хрысціянстве (запавет «Узлюбі бліжняга, як сябе самога», ідэал спачувальнай, ахвярнай любві); у класічных этычных вучэннях (Д.Юм, Ж.-Ж. Русо, І.В.Гётэ, І.Гердэр, А.Конт, Ф.Фербах, М.Г.Чарнышэўскі, Ф.М.Дастаеўскі, Л.М.Талстой, У.С.Салаўёў). А. выцякае з залатога правіла маральнасці, засн. на роўнасці і ўзаемапавазе. Этыка гуманізму ўключае ў сябе альтруістычныя ўстаноўкі. Канкрэтныя формы А. — міласэрнасць, дабрачыннасць, філантропія і інш. А. з'яўляецца характэрнай рысай нац. свядомасці многіх народаў, у т.л. беларусаў, яскрава праяўляецца ў творчасці бел. майстроў л-ры і мастацтва.

*Літ.*: Ш в е й ц е р А. Культура и этика. М., 1973; С о л о в ь е в В.С. Оправдание добра. Т. 1. М., 1988. *В.Р.Языковіч.*

**АЛЬТЭРА́ЦЫЯ** (ад лац. alteratio змяненне), 1) у м у з ы ц ы павышэнне або паніжэнне на паўтон альбо цэлы тон ступені гукарада без змены яе назвы. Знакі А.: ♯ (дыез, павышэнне на паўтон), ♭ (бемоль, паніжэнне на паўтон), 𝄪 (дубль-дыез, павышэнне на тон), ♭♭ (дубль-бемоль, паніжэнне

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ